# Альбін Юльянавіч Маціеўскі



жыў у вёсцы Копцеўшчына Нясвіжскага раёну. Нарадзіўся 25.06.1925 у весцы Задзвея Гродзенскай вобласці. У 1944 годзе,калі споўнілася 18 гадоў забралі на фронт, дайшой да Вены. Пасля вайны служыў у Астрыі да 1949 г. у ВДВ.





Альбін Юльянавіч расказваў:

– Я быў аўтаматчыкам-разведчыкам 783 стралковага палка 229 стралковай дывізіі. Памятаю, як вясной 45-га пераходзілі Одэр на пантонным мосце. Наша задача заключалася ў тым, каб штурмаваць нямецкі гарнізон на тым баку ракі. А там фашысты адстрэльваліся на даху дома, і мы атрымалі загад выкурыць іх адтуль. Прыкацілі нашы гармату і далі залп па ворагах. Нехацелі яны здавацца, але мы перамаглі ў тымбаі і 30 немцаў узялі ў палон.

Незабываў ветэран і пераход праз Віслу, дзе загінула многа нашых салдат. Былі наступленні, цяжкія салдацкія дарогі,страта сяброў. Нібы ўчора, з горыччу глядзеў, як паміраў на руках у яго камандзір узвода. А ён хораша іграў на гармоніку. Выпрабаваў лёс і А.Ю.Маціеўскага, калі цэліўся ў яго нямецкі снайпер, пуля якога прабіла шапку, а галаву незакранула. Гэта салдацкае шчасце і лёс спрыялі салдату. А ён быў смелы, адважны, не адзін раз хадзіў у разведку, і “языка” браў з баявымі сябрамі. Вырашылі правесці аперацыю ноччу. Бясшумна скочылі ў траншэю, захапілі аднаго немца. За гэту начную вылазку, важныя звесткі, здабытыя ў разведцы, А.Ю. Маціеўскі быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Радасныя дні Перамогі аўтаматчык сустрэў у Германіі, на мяжы з Чэхаславакіяй. Памятае, як недабітыя немцы здаваліся ў палон. І калі 8 мая аб’явілі абкапітуляцыі Германіі, радасці было…. І смутку пазагінулых, хто недажыў 2-3 дні да Перамогі. Альбін Юльянавіч меў шмат узнагарод: ордэны Славы III ступені, Чырвонай зоркі, Вялікай Айчыннай вайны II ступені, медаль “За перамогу над Германіяй”. У нашай вёсцы ёсць помнік ахвярам вайны. У брацкай магіле ляжыць 5 партызан і 5 мірных жыхароў. Гэта напамін усім нам аб той страшнай вайне. Пайшоў з жыцця Альбін Юльянавіч, пахаваны ён на вясковых могілках, але не забываем мы пра яго, наведваемся да яго на магілу.





Гецман Екатерина Михайловна
Старший преподаватель кафедры «Электрические системы» ЭФ

Белорусский национальный технический университет

Управление по воспитательной работе с молодежью

Выставка "История Великой Отечественной войны в лицах"

Е. М. Гецман

# МАЦІЕЎСКІ АЛЬБІН ЮЛЬЯНАВІЧ

Минск БНТУ 2019